чэрвень 2021

**Дыктант**
**для правядзення ўступных іспытаў**
**па вучэбным прадмеце «Беларуская мова»**
**пры прыёме асоб у VIII клас**
**для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі**
**ў дзяржаўнай установе адукацыі**
**«Мінскае абласное кадэцкае вучылішча»**

## Лета набірае сілы

Лета набірае сілы.

Радасна вітаюць рознагалоссем новы дзень птушкі. Гамоняць пад ціхімі павевамі ветру лёгкія каласы з жоўтымі пяшчотнымі завушніцамі на іх. Яны нібы цягнуцца да празрыстага неба і просяць спагады ў прыгожыя часы свайго красавання. І хоць няма ні зярняці ва ўсім хвалюючым моры, але ўжо чуецца ледзь-ледзь хлебны пах, які так прыемна казыча ноздры.

Вельмі прыгожая зямля ў гэты час. У які бок ні пойдзешь, усё гамоніць з табою. Пад гарачымі прамянямі сонца красуе густы цёмна-зялёны ячмень, фанабэрыста распускаючы мяккія вусы. Авёс шаманіць галінкамі, нібы адмысловымі каралямі. Доўгімі пазелянелымі шнурамі выцягнулася бульба. Толькі расплюшчвае блакітныя вочы лён, а на сенажацях не пералічыць кветак. (109 слоў)

*Паводле П.Броўкі.*